**В. Г. Качан**

**Г. Мінск**

# З ПАШАНАЙ І ЎДЗЯЧНАСЦЮ

Мікалай Васільевіч Бірыла пакінуў светлы след у маёй душы, след надоўга, а не на адно імгненне. Гэта святло людскасці, ахвярнасці, вернасці абранаму шляху, вернасці беларускаму слову і справе. Дзякуючы Мікалаю Васільевічу беларуская філалогія стала для мяне лёсам, радасцю і болем, духоўным хлебам жыцця. Ён перадаў усім нам, сваім вучням і паслядоўнікам, клопат Чалавека, Вучонага, улюбёнага ў беларускае слова, з рук у рукі, з душы – у душы, з сэрца – у сэрцы.

Талент, памножаны на штодзённую руплівую працу, прынёс вядомасць і павагу Мікалаю Васільевічу далёка за межамі нашай роднай Беларусі. Мікалай Васільевіч Бірыла – адлзін з нямногіх мовазнаўцаў, якія валодаюць настолькі шырокім, сапраўды акадэмічным дыяпазонам навуковых інтарэсаў – беларуская дыялекталогія, сучасная беларуская літаратурная мова, анамастыка, лексікаграфія. Ён мог даць адказы - грунтоўныя і пераканальныя – па дыскусійных, складаных пытаннях беларускага мовазнаўства.

Лёс Мікалая Васільевіча невымерна плённы на выдатныя здабыткі, ён дасягнуў значнага выніку ў розных накірунках навуковай дзейнасці. Пасля заканчэння ў 1947 годзе філалагічнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута Мікалай Васільевіч працаваў у Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва, а з 1952 года – у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. На працягу 1956-1958 гадоў ён быў прафесарам кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, а з 1959 года – загадчыкам сектара навуковай тэрміналогіі, затым з 1964 года – сектара сучаснай беларускай літаратурнай мовы і культуры мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. У 1969 годзе Мікалай Васільевіч атрымаў навуковую ступень доктара філалагічных навук, а ў 1971 годзе - званне прафесара.

За ганаровымі званнямі і ўзнагародамі Мікалая Васільевіча (член-карэспандэнт, акадэмік АН, Заслужаны дзеяч навукі, акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук, саветнік пры Прэзідыуме АН Беларусі) бачыцца не толькі прызнанне заслуг Вучонага. За імі – гады настойлівай, творчай, таленавітай працы, вынік шчырай улюбёнасці ў сваю справу, што выпадае на лёс толькі тых людзей, якім пашчасціла знайсці сваё сапраўднае прызванне.

Пачатак у навуковай спадчыне Мікалая Васільевіча Бірылы паклалі працы па фанетыцы беларускай мовы. Іменна з гэтых прац пачалося стаўленне сур’ёзнага, удумлівага навукоўца, патрабавальнага да сябе, нястомнага ў працы. З бібліяграфіі навуковых работ Вучонага відаць: шмат выдадзена асабіста, многае – у супрацоўніцтве. Усе выданні дакладна характарызуюць Мікалая Васільевіча як

Репозиторий БГПУ

сур'ёзнага даследчыка, чалавека вялікага розуму, здольнага апярэджваць час, не толькі бачыць нераспрацаваныя дзялянкі ў галіне беларускага мовазнаўства, але і брацца за іх распрацоўку. У яго заўсёды была новая ідэя, быў новы накірунак у пазнанні мовы.

Безумоўна, імя Мікалая Васільевіча Бірылы вядома ў першую чаргу як укладальніка комплексу работ "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (1963) і "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968-1969), за які ў 1971 годзе Мікалаю Васільевічу Бірылу разам з іншымі аўтарамі прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, як аднаго з сааўтараў і рэдактараў шматтомнага "Лексічнага атласа беларускай мовы", аднаго з выканаўцаў і кіраўнікоў лінгвагеаграфічнай працы "Агульнаславянскі лінгвістычны атлас" (АЛА), што выконвалася вялікім міжнародным калектывам.

Мікалай Васільевіч Бірыла – заснавальнік лінгвістычнай школы, беларускай анамастыкі. Ён аўтар трохтомнай манаграфіі "Беларуская антрапанімія". У апошнія гады жыцця даследчык працаваў над чацвёртым томам "Беларускай антрапаніміі", "Слоўнікам беларускіх прозвішчаў", "Анамастыконам Вялікага княства Літоўскага XVI ст."

Як вядома, лінгвістычная школа Мікалая Васільевіча – гэта не толькі вызначанае кола праблем, якія глыбока ім распрацоўваліся, але і вучні, паслядоўнікі.

Праз школу Мікалая Васільевіча прайшло многа людзей. Я належу да тых "гордых арлянят", што вылецелі з акадэмічнага гнязда. І гэтым ганаруся. Я мела шчасце вучыцца працаваць у Мікалая Васільевіча. Ён быў маім Настаўнікам, якога я сустрэла на парозе свайго сталення, духоўнага росту. Іменна ён вывеў мяне ў людзі, у філалогію, у жыццё.

Добра памятаю нашу першую сустрэчу, калі я прыйшла працаваць у Інстытут мовазнаўства ў сектар сучаснай беларускай мовы, загадчыкам якога і быў акадэмік АН БССР Мікалай Васільевіч Бірыла. Адбылася наша сустрэча ў 80-ыя гады, якія сталі пераломным часам у гісторыі Беларусі. Відавочна актывізавалася грамадская актыўнасць; ладзіліся канферэнцыі, вечарыны у бібліятэках, на гарадскі і нават рэспубліканскі маштаб выйшла дыскусія пра ролю і месца беларускай мовы ў БССР. Акадэмік М. В. Бірыла быў адным з выдатных прадстаўнікоў беларускай навуковай інтэлігенцыі. Зразумела маё хваляванне. Памятаю, што мне так і не спатрэбіліся тыя спецыяльна падрыхтаваныя і вывераныя мною словы. Праз некалькі хвілін размовы мне хацелася расказаць гэтаму вялікаму Вучонаму пра ўсё, пра ўсё: і пра тое, як я хвалююся, і пра сваю ўлюбёнасць у функцыянальны сінтаксіс, і пра тое, што ў мяне ёсць дачушка і зваць яе Ірына… Мікалай Васільевіч быў вялікі і просты, ён ніколі не дэманстраваў ні перад кім сваёй перавагі і значнасці, быў добрым, сардэчным і сумленным чалавекам са светлай і адкрытай душой.

Мікалай Васільевіч шчыра радаваўся поспехам тых, з кім працаваў. Да ўсіх членаў сектара ставіўся з павагай, умеў тактоўна параіць, далікатна падказаць, своечасова падтрымаць і як загадчык рабіў усё для ўзрошчвання новай кагорты беларусістаў. Навуковы рост сектара быў вызначальным у яго працы. Не спыняцца на дасягнутым, ісці наперад – так працаваў Мікалай Васільевіч, вучыў

Репозиторий БГПУ

так працаваць і нас, ён даў нам асэнсаванае разуменне таго, што значыць па-сапраўднаму працаваць на ніве беларускай філалогіі.

Памятаю свае першыя, няўпэўненыя публікацыі па тэме дысертацыі. Толькі-толькі ў беларускім мовазнаўстве пачалі вырашацца праблемы даследавання сінтаксічнай семантыкі ў аспекце тэорыіі поля. Маім першым дарадчыкам, кансультантам і навуковым кіраўнікам быў Мікалай Васільевіч. Колькі ж трэба было мець фізічных і маральных сіл, каб цярпліва папраўляць напісанае, падказваць і накіроўваць, хваліць (“Талантліва.”, “Пераканаўча.”), каб заахвоціць на працу далей і благаслаўляць у друк. Ён дапамагаў, падтрымліваўі заахвочваў да працы.

Эрудзіраваны, дасведчаны, інтэлігентны і тактоўны чалавек, Мікалай Васільевіч для многіх людзей быў знакавай асобай. Ён быў не толькі выдатным Вучоным, але і сапраўдным педагогам, Настаўнікам, які здольны быў адчуваць і прымаць блізка да сэрца чужы боль, як свой асабісты. Многія жыццёвыя сітуацыі і сустрэчы запомніліся, але найбольш адзін урок, што проста ўрэзаўся у памяць і пра які я ніколі не забываю падчас зносін з людзьмі. У меня памёр бацька. Яму было ўсяго пяцьдзясят чатыры гады. Я страціла і любімага тату, і блізкага сябра. Замкнулася ў сабе,перастала быць такой адкрытай, як раней, а ў першыя дні не магла нават ні з кім гаварыць. Падыдзе да мяне хто-небудзь з маіх калег, падыму вочы і не магу стрымаць слёз. А аднаму вельмі цяжка… Выратаваў мяне, даў сілы жыць Мікалай Васільевіч. Пры яго занятасці, значнасці і важнасці пытанняў і праблем, якія ён вырашаў кожны дзень як акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР, ён прыйшоў у сектар і сказаў: “Трэба быць сярод людзей, з людзьмі. У мяне ў Інстытуце многа спраў. Вы будзьце побач. Калі не зможаце падтрымліваць размовы, тады проста слухайце, старайцеся пачуць іншых.” Мы ішлі з ім па калідоры Інстытута, сустракаліся з супрацоўнікамі, віталіся з усімі, заходзілі ў іншыя аддзелы, пыталіся, як справы, ішлі далей… Мікалай Васільевіч заўсёды спадзяваўся на людскую сумленнасць, сам з людзьмі Чалавекам быў, быў і застанецца ў памяці ўсіх, хто яго ведаў. Хочацца са шчырай удзячнасцю прыгадаць мудрыя парады і такія патрэбныя словы падтрымкі дарагога Настаўніка.

Хочацца яшчэ сказаць пра тое, што мяне заўсёды ўражвала і захапляла ў Мікалаю Васільевічу. Гэта трываласць, мужнасць, уменне трымацца ў самыя складаныя моманты жыцця. Успамінаюцца неспакойныя, клопатныя дні, калі пад сумненне ставіўся ўдзел Мікалая Васільевіча ў партызанскім руху ў час Вялікай Айчыннай вайны. Усе супрацоўнікі Інстытута прысутнічалі на адкрытым сходзе, куды былі запрошаны партызаны, з якімі Міклай Васільевіч ваяваў поплеч. Памятаю, як у маім сэрцы ў адным вялікім пачуцці спляліся боль і роспач за тых людзей, у душы якіх, відаць, жылі зайздрасць і недавер, з гонарам і яшчэ большай павагай да Мікалая Васільевіча.

Прайшлі гады, навуковыя працы Мікалая Васільевіча Бірылы і сёння карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам. Яны спрыяюць развіццю і ўзбагачэнню мовазнаўчай навукі ў Беларусі. Яго навуковая дзейнасць служыць узорам для сучасных навукоўцаў. Мікалай Васільевіч жыве сярод нас сваімі кнігамі, сваёй дачушкай, сваім унукам. Сведчаннем таго, што Мікалай Васільевіч заўсёды ў нашай памяці, з’яўляецца і гэтая канферэнцыя. Дзякую яе арганізатарам, асабліва

Репозиторий БГПУ

доктару філалагічных навук Валянціне Паўлаўне Русак. Ведаю, як яна рыхтавалася, старалася, збірала па крупінках нашу памяць пра Чалавека, якога мы любім, шануем, якога глыбока паважаем, які з’яўляецца для нас найпершым аўтарытэтам.

Репозиторий БГПУ